# За лепшае кіраўніцтва ў Бэлер Менску

Корпораца Бэлер Менск можа стаць выдатнаю гаспадарскаю ўстановаю беларускай ув Амэрыцца. Да існуючага ўжо асяродку ў Глен Спэй можна дадаць, у гэтай самай галіне супачынкавай дзейнасьці, морскі асяродак ля берагу акіяну, каб людзі маглі выкарыстаць морскае купаньне з канцатыднёвым разьвесяленьням у Бэлеру. Падобна можна ўладзіць зімовы супачынак Беларусам у Маямі (Флёрыда) або ў Сан Гуан (Порторыка). У вабодвых тропікальных местах ёсьць пакаёвыя дамы ля мора зь вельмі нізкой платаю за гасподы й пакоі ў іх. На гэта патрэбная толькі прадпрыймальнасьць кіраўніцтва корпорацы і блізу ніякіх грошай на ўклад.

Корпораца можа заняцца большай разбудоваю беларускага землясобсьніцтва ў Задзіночаных Гаспадарствах Амэрыкі, купляючы новыя землі і дзелячы іх на сялібныя дзялянкі. Гэта можна зрабіць і дзеля продажы шырокаму грамадзтву. Можна зарабіць без укладаньня шмат грошай. Заработак пэўны, але патрэбная прадпрыймальнасьць кіраўніцтва.

Корпораца магла заняцца господнім (кватэрным) гаспадараньням, прыдбаючы або рандуючы дамы ў большых местах Нюёрскай аколіцы. Шмат хто з нашых з гэтага жывець, ёсьць здатныя да гэтага гаспадары: корпораца магла гэтым заняцца.

Павышэньне даверу да корпорацы дало б магчымасьць уладжаньня касы ашчаднасьці пры ёй. Корпораца можа даць 6 працэнтаў кажнаму ўкладаючаму: а гэта на паўтара працэнта болей за тое, што нашыя людзі адзержуюць, кладучы грошы да банку. Тое, што плацім за гіпатэку (моргідж) банку, маглі б адзержаваць свае людзі. Патрэбны толькі давер людзёў да кіраўніцтва корпорацы.

Але кіраўніцтва намагалася прыдбаць грошы абдзіраньням давяданьнікаў, высокай платаю за пакоі, напіткі. Яшчэ той год гэта можна дараваць, але сёлета будзем плаціць стэйтавы падатак. Дык кажны грош, сарваны з нас, пойдзе часткава не корпорацы, але стэйту.

Благое кіраўніцтва паніжала сабекошт рэсорту зьмяншаньням абслугі, брудам а шумецьцям. Не праводзілі рамонту, і абсталяваньне рэсорту бязуважна развалевалася, зацякала, ламалася, гніло.

Юрцэвіч хваліцца будаваньням залі–бару ў гэтым часе. Але ці кіраўніцтва дагледзіла, колькі заганаў супроць пляну зроблена? Ужо ў гэтым сэзоне трэба будзе перарабляць кадзе зробленае. Акон уставілі толькі, што ў холад нельга там вытрываць, а сонечнага дня мост (падлога) пражыцца сонцам. Замест пара даляраў на пустакі Юрцэвіч уставіў колькі сотняў на вокны. Корпораца кажны год будзе больш выдаваць за ўдзяржаньне акон у добрым стане. А пустакі ніякага рамонту не патрабуюць.

Замест заплаціць за матар’ял у пару, Юрцэвіч ізь Пелясом агіляліся з платаю і трацілі каштоўны спуск ды плацілі ад корпорацы штрафныя працэнты.

„Вялікі эканамісты“ Мярляк ня толькі што не зьвярнуў увагі на раськідонлівае гаспадараньне, але й сам дакладаўся да тога, каб ціха й плаўна грамадзкія грошы расплываліся.

Дагэтулешняе кіраўніцтва тры гады гаспадарыла самацёкам на рэсорце. Нічога новага ані прыдбана, ані ўладжана. Людзі ня мелі й ня маюць даверу да такіх кіраўнікоў, як Юрцэвіч, Мярляк, Пеляса.

Патрэбна лепшае кіраўніцтва Бэлер Менску. Патрэбныя людзі з галавою.

# Яшчэ пра нішчэньне Бэлер Менску

Юрцэвіч сваёй „гаспадаркаю“ нарабіў гэтулькі шкоды рэсорту Бэлер Менску, што яшчэ трэба дадаць да таго, што я пісаў у сваім зьвярненьню, 10 верасьня 1965 г., і ў вартыкуле ў № 1 „Незалежніка“.